УДК. 94(476):323.17 «1917»

А. А. Райчонак, дац., канд. гіст. навук (БДТУ, г. Мінск)

# ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ПРАБЛЕМ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ ПАСЛЯ КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ 1917 Г.

Найважнейшай крыніцай у асвятленні пытання ідэалагічнай барацьбы у працэсе станаўлення беларускай дзяржаўнасці з'яўляецца літаратура, створаная прадстаўнікамі беларускага нацыянальна-дэмакратычнага руху. Каштоўнасць іх творчасці абумоўліваецца тым, што яны не толькі з'яўляліся сведкамі тых гістарычных падзей, але непасрэдна ўплывалі на іх. З другога боку, гэтым абумоўлены і іх галоўны недахоп – суб'ектывізм у трактоўцы гістарычных падзей. Трэба зазначыць, што дадзены недахоп у меншай ступені закранае акалічнасці ідэйнай барацьбы вакол праблемы беларускай дзяржаўнасці.

На наш погляд найбольшую цікавасць з работ напісаных у дадзены перыяд. Выклікаюць працы: А. І. Луцкевіча, Я. Я. Варонкі, А. І. Цвікевіча, К.С. Езавітава, М. В. Доўнар-Запольскага, В. З Гадлеўскага, Е. С. Канчара, Ф. М. Турука, З. Х. Жылуновіча, В.Г. Кнорына, А.Р.Чарвякова, Г. П. Парэчына.

Характарызуючы перыяд 20-х гадоў увогуле, можна зазначыць, што яму ўласціва паступовая эвалюцыя ад мірнага суіснавання розных думак і поглядаў на праблему стварэння беларускай дзяржаўнасці да панавання бальшавіцкага погляду на дадзеную праблему і пачатак барацьбы з любымі праявамі іншадумства.

З агульна-метадалагічных праблем, характэрных для гэтага перыяду, на наш погляд, галоўнымі з'яўляюцца: блізкая адлегласць публікацый ад падзей, якія ў іх аналізаваліся, што ў поўнай меры не давала магчымасці ацаніць гістарычную значнасць тых ці іншых фактаў, і пэўная ідэалагічная ангажаванасць іх аўтараў, што ў сваю чаргу, замінала непрадузята ацэньваць як свае ўласныя дзеянні, так і дзеянні сваіх палітычных апанентаў. На нашу думку, тут да месца будзе прыгадаць выказванне А. Луцкевіча з прадмовы да кнігі "За дваццаць пяць гадоў": "Дык няхай даследчыкі нашага адраджэння ня шукаюць у гэтых успамінах адказу на зусім натуральнае пытанне: чаму тое ці іншае сталася, бо выкрыць прычыну гэтага – задача гісторыка." Такім чынам, дадзены перыяд з'яўляецца першым перыядам у станаўленні пасля кастрычніцкай гістарыяграфіі праблем рэвалюцыі і дзяржаўнага будаўніцтва Беларусі.